Мурашова А.С., студ. гр. 414 а ФТБКіСМ
БДУКМ
Навуковы кіраўнік – Аляхновіч А.М.,
кандыдат філалагічных навук, прафесар

# ТЭАТРАЛЬНАЯ РЭЖЫСУРА Ў СУЧАСНЫМ НАРОДНЫМ СВЯЦЕ

Як вядома, у народным святце ўвасабляюцца прынцыпы і метады тэатральнай рэжысуры.

Тэарэтычным падмуркам выкарыстання асноў тэатральнай у святце з'яўляецца думка ў У.І.Неміровіча-Данчанка, што прафесійная аснова рэжысуры тэатра, масавага дзеяння, эстрады, кіно – адна, бо іх яднае прырода рэжысёрскай творчасці: рэжысёр- тлумачальнік, рэжысёр – люстэрка, якое адлюстроўвае індывідуальныя якасці акцёра, рэжысёр – арганізатар.

Як вядома, традыцыйнымі кампанентамі тэатральнай рэжысуры з'яўляюцца:мастацка-вобразнае мысленне, кампазіцыйная пабудова спектакля, сцэнарна-рэжысёрскі ход, скразное дзеянне, мастацкі вобраз, канфлікт, архітэктоніка і інш.

Зразумела, што ў народным святце гэтыя кампаненты пераасэнософваюцца, таму што яно мае сваю спецыфіку, "сваіх артыстаў", свае мастацкія задачы, рэжысёрскае вырашэнне і інш. У той жа час многія элементы тэатральнай рэжысуры былі запазычаны ў глыбокай старажытнасці з народнага свята, паколькі яно ўзнікла раней, чым тэатральная рэжысура. Таму лагічна ўявіць, што некаторыя элементы тэатральнай рэжысуры захоўваюцца ў народным святце, а іншыя трансфармуюцца ў новыя, вызначаныя характарам святочнай дзеі.

На наш погляд, нельга не пагадзіцца з канцэптуальнай думкай, якую вызначыў рэжысёр Таіраў, што п'еса – гэта "матэрыял для спектакля" [8, с.43], яе можна з упэўненасцю ўвасобіць у формуле: народнае свята – гэта "матэрыял для масавага відовішча".

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Каб высветліць спецыфіку тэатральнай рэжысуры ў народным святе, паспрабуем зрабіць параўнальны аналіз тэатральнага спектакля і народнага свята. Як вядома, сюжэт для тэатральнага спектакля напісаны аўтарам (драматургам), які вызначае яго тэму і ідэю, адлюстроўвае эпоху, у якой адбываецца сцэнічная дзея, увасабляе культурныя і духоўныя запросы грамадства. У народным святе больш цяжка вызначыць аўтара, паколькі яно дайшло да нас з сівой старажытнасці, адлюстроўвае міфалагічнае мысленне старажытнага чалавека,звязана з яго працоўнай дзейнасцю, а таксама календарнымі цыкламі і касмічнай прасторай. Такім чынам, аўтарам народнага свята з'яўляецца народ, які перадае ў ім шматвяковую гісторыю свайго існавання. Таму зразумець сапраўдную існасць абрадава-святочнай культуры беларусаў – складаная справа для рэжысёра, якая патрабуе шмат тэарэтычных ведаў у розных гуманітарных навуках. Абсалютна відавочна, што межы спектакля абмежаваны аўтарствам, а межы народнага свята, па сутнасці, з'яўляюцца бясконцымі асабліва ў сваіх лакальных варыянтах. Менавіта апошнія надаюць святу ўнікальнасць і непаўторнасць.

На нашу думку, менавіта фабула спектакля, выкарыстаная тэатральным рэжысёрам вызначаецца элементамі мастацкай трактоўкі падзеі, якая ў кожнага з рэжысёраў спецыфічная, а рэжысёр народнага свята заўсёды абавязан лічыцца з галоўнай думкай народнага свята, вымушаны абвяжоўваць уласнае бачанне законамі існавання народнага свята. Яно існуе ў сінкрэтычнай суцэльнасці, адзінстве, мастацкай непадзельнасці са старажытнымі вераваннямі, светапоглядам, эстэтыкай, этыкай народа і міфалогіяй, таму што яна – шматслойнае, насычанае этнакльтурнай інфармацыяй і структурна багатае ўтварэнне, якое акумулюе багатую этнічную спадчыну і вынікі міжкультурных стасункаў.

Нельга не пагадзіцца з думкай рэжысёра А.Я.Камінскага, які разглядаючы спецыфіку народнага свята, слушна адзначае ролю таленавітага знаўца традыцыі: "кожны з іх спачатку быў гледачом, затым удзельнікам, выканаўцам і ўжо потым арганізатарам абраду. Тым не менш формай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

трансляцыі і захавання абрадавых практык у сістэме святочнай культуры новага часу адначасова могут з'яўляцца працэсы рэстаўрацыі, рэканструкцыі, стылізацыі, транфармацыі рытуальных сегментаў свят"[3,с.94-95].

Разгледзім спецыфіку рэжысуры народнага свята. Агульнавядома, што ў народным свяце тэма – гэта жыццёвая з'ява, падзея, адлюстраваная пры дапамозе сродкаў мастацкай выразнасці.Тэма – гэта праблема, актуальная для многіх, якая патрабуе тэарэтычнага і практычнага вырашэння.

Ідэя адлюстроўвае мастацкую задуму сцэнарыя і асноўны змест свята.

Тэматычны блок выступае як сукупнасць эпізодаў, аб'яднаных алдзіным сцэнічным заданнем і адлюстроўвае аўтарскую канцэпцыю, якая мае некалькі аспектаў.

Архітэктоніка – пабудова народнага свята, якая вызначае сувязь паміж асобнымі часткамі і рэжысёрскую задуму.

Сцэнарна-рэжысёрскі ход – гэта мастацкі прыём, які аб'ядноўвае развіццё ўсіх абрадавыз дзей. Кожны рэжысёр абавязан знайсці арыгінальны сцэнарна-рэжысёрскі ход, які адлюстроўвае яго аўтарскі стыль.

Мастацкі вобраз – гэта адлюстраванне тыповых рыс з'явы,у яе архітэктурна-дэкаратыўным, пластычным і музычным увасабленнях.

Сімвал (ад грэч. Symbolon - знак) – выразны элемент святочна-абрадавай дзеі, які перадаецца з пакалення ў пакаленне.

У заключэнні адзначым, што рэжысура народнага свята мае сваю спецыфіку ў адрозненне ад тэатральнай рэжысуры. Яна вызначаецца характарам працоўнай дзейнасці чалавека, рэгламентам народнага календара, удзелам шматлікіх выканаўцаў і гледачоў, адсутнасцю падзелу паміж імі, гульнявым характарам. У спектаклі назіраецца раздзяленне выканаўцаў і гледачоў, пэўная абмежаванасць характара імправізацыі, акцёрскай ігры, сінтэза розных відаў народнай творчасці, аматарскага і прафесійнага мастацтва.

Рэжысура народнага свята разгортваецца ў накірунку развіцця падзейнага раду, які мае відошчны аспект. Рэжысёр абавязан пры ўзнаўленні

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

народнага свята ўлічваць асаблівасці народнай рэжысуры, накіраванай на максімальнае ўзнаўленне ў свяце яго традыцыйных кампанентаў.

Таму галоўнай задачай сучасных сцэнарыстаў і рэжысёраў масавых дзей з'яўляецца стварэнне новага гульнявога, рытуальнага і пазабрадавага комплексу свят і прадстаўленняў, заснаванага на шматвяковых традыцыях актывізацыі насельніцтва да ўдзелу, пераемнасці духоўных каштоўнасцей.

Спіс запазычанай літаратуры:


1. Вуглік, І.Р. "Міфалогія беларусаў: навучна-метадычны дапаможнік"/І.Р.Вуглік. – Мінск: Сучасныя веды, 2005, с.150.

2. Камінскі, А.Я. "Асновы драматургіі і сцэнарнага майстэрства: вучэбна-метадычны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных установ па спецыяльнасці "Рэжысура свят""/А.Я.Камінскі; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.-Мінск: БДУКіМ, 2011, с.110.

3. Камінскі, А.Я. "Рэжысура традыцыйнага абраду: вучэбна-метадычны дапаможнік"/А.Я.Камінскі; Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.-Мінск: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў, 2009, с.110.

4. Ліцвінка, В.Дз. "Святы і абрады беларусаў" / Васіль Ліцвінка. – 3-е выд. – Мн.: Беларусь, 2001, с.188.

5. Немирович-Данченко, В.И. "Рецензии. Очерки. Статьи. Интревью. Заметки, 1887 - 1942" / [Вступит. Статья, с. 5-52, м коммент. Л.М. Фрейдкиной]. – Москва: Всерос. театр. о-во, 1980, с.375.

6. Новак В.С.і Штэйнер І.Ф. "Сцэнізацыя фальклорных свят і абрадаў"/В.С.Новак і І.Ф.Штэйнер. – Мазыр: Рэклам.-выд. Фірма "Белы вецер", 1999, с.169.

7. Станиславский, К.С. "Моя жизнь в искусстве".-Москва: Искусство, 1983, с. 424.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

8. Таиров, А.Я. . “[О театре]: Записки режиссёра, статьи, беседы, речи, письма”/[Коммент. Ю.А. Головашенко и др.]. – Москва: Всерос. Театр. о-во, 1970 , с. 603

9. Шамак, А.А. “Міфалогія беларусаў: вучэб. Дапам.”/А.А. Шамак; Установа адукацыі “Беларус. дзярж. пед. ун-т імя М.Танка”. – Мн.: Вучэб. – выд. цэнтр БДПУ, 2004.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ